Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

**Выходзіць што тыдзень.**

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.

Цэна з перэсылкай і дастаўкай на 1 г. — 2 р. 50 к., на 6 мес. — 1 р. 25 к на 3 м. — 65 к., на 1 мес. — 25 к. За граніцай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. — 2 р. 3 мес. — 1 р. Перамена адрэсу — 20 коп.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнцыі, прысланые у рэдакцыю, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ надпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакцыі. Рукапісы аўторам не вертаюцпа назад.

Год VIII. 2 Жніуня 1913 г. №. 31.

## Згода.

Такі згоду балканцы ізноў зрабілі. Боўгары, румыны, грэкі і сэрбы пускаюць сваё войска да хаты. Дабычу „падзялілі“. Але за ўсё заплацілі адны боўгары, хаця яны-ж самі найболей стараліся у вайне с туркамі, ды сваей крывёй найбольш зямлі адваевалі. Цяпер частку гэтай зямлі адабралі ад іх сэрбы, частку—грэкі, каторые чапіліся зусім адцісnуць боўгароў ад мора,—ды ешчэ добры кусок адхапілі назад туркі.

Гэтаго мала: румыны, за тое, што ціха сядзелі ў часі вайны с туркамі, цяпер адрэзалі кусок сумежнай з імі боўгарскай зямлі, каторая здаўна належала да Боўгарыі.

Так Боўгарыя, каторая пасьля першай балканскай вайны зрабілася найдужэйшай, цяпер загубіла зусім свае сілы. А яе суседзі баюць байкі аб сваей „прыхільнасьці“ да яе...

Але да поўнай згоды на Балканах ешчэ далёка. Пачалася спорка паміж туркамі і боўгарамі за Адрыанополь. І ня толькі з боўгарамі: болгары самі ні маюць сілы адваеваць Адрыанополь, дык за іх уступаецца Расея, думаючы, што пры гэтым і ей удасцца „зарабіць“. Але з гэтаго можэ пайсьці новая спорка, бо другіе вялікіе дзержавы ні надта хочуць адбіраць ад туркоў Адрыанополь.

Поруч з гэтай споркай ідзе ешчэ другая. Гэтак, новым „раздзелам“ быўшаў турэцкай зямлі паміж грэкамі і боўгарамі надта нездаволены французы, каторые баяцца, каб Грэція не узмацавалася лішне. І хаця Францыя і Расея—гэта хаўрусніцы, ўсе-ж такі яны ня могуць у гэтай справі пагадзіцца, бо Расея не здаволена раздзелам.

Так пачынаецца ешчэ адна спорка. А з гэтаго відаць, што балканскіе справы могуць заблутацца ешчэ болей.

## Беларускі Студэнцкі Кружок.

Гэтымі днямі атрымалі мы: «Атчот аб дзеяцельнасьці Беларускаго Навукова - Літэратурнаго Кружка Студэнтоў Пецярбурскаго Унівэрсытэта» Кружок гэты заложэн быў пад вясну 1912 года, працай і стараньнем студэнтоў: Пушкарэвіча, Хлебцэвіча, Тарашкевіча, Адамовіча, Каспэровіча, Курылёнка, Сушынскаго, Дзедовіча, Лося, Душэўскаго, Кавалевіча, Бычкоўскаго, Цыбульскаго, Давідовіча, Алексюка і Вярбіцкаго. На кіраўніка Кружком выбралі студэнты прафэсара Роэнфэльда.

Мэта Кружка—навуковае пазнаньне духоўнаго і грамадзянскаго жыцьця беларускаго народу, яго мовы, літэратуры, народнай творчасьці, этнографіі, статыстыкі, народнай гаспадаркі. Дзеля гэтай мэты Кружок мае права збірацца у сценах Унівэрсытэту.

Пачатак работы Беларускаго Студэнцкаго Навуковаго Кружка, лепшая часць прэдстаўнікоў расейскай навукі і грамадзянства спаткала прыхільна.

Як відаць с таго-ж атчоту, многа памагае Беларускаму Студэнцкаму Кружку акадэмік А. Шахматов: Прафэсар А. Погодін прыслаў студэнтам беларусам ліст у каторым кажэ:

„Вашы стараньня падняць нацыянальную сьвядомасць беларускаго народу, вызываюць ва мне самую гарачую сымпатію? „Над гэтым трэба працаваць, дзеля таго, што для народу ня можэ быць культурнаго развіцьця паміма сьвядомасьці аб сваей нацыянальнай самабытнасьці“. „Я вітаю працу беларускай маладзежы, каторая кіруецца да нацыянальнай асьветы беларускаго народу“. „Дзеля гэтай ідэі варта жыць!“ — заканчывае сваё пісьмо прафэсар Погодін.

Блізка што гэтак сама аднёсся да беларускай маладзежы і прафэсар Овсяніко - Куліковскій, выяўляючы свой спогад адраджэньню беларускаго народу, ён кажэ, што людзкасць будзе тым больш багатай духоўна, чым болей нацыянальнасьцей увойдзе ў склад яе, багацючы агульна людзкую культуру сваімі духоўнымі нацыянальнымі асобнасцямі.

Е. Романов (беларускі этнограф) пішэ у сваім пісьме Кружку: „Працуйце і на экономічным грунце. Ратуючы народ ад экономічнай залежнасці, ад яго ворагоў, вы уратуеця яго і ад духоўнай няволі. Паступайця так, як робяць палякі у сваімкраю: устраівайця хаўрусы, склады, таварыствы, кассы і інш. Але у забітаго і загнанаго народу німа ініцьятывы. Ваша найбліжэйшая павіннасць зрабіцца ініцыатарамі. «Няўжо-ж мы горшые за людзей»—заканчывае гэткім пытаньнем сваё пісьмо Е. Романов.

У канцы атчоту надрукаваны падробны спісак усіх прац кружка за мінуўшую зіму і з яго відаць, што беларуская маладзеж пачынае сьвядома і сурьёзна аднасіцца да сваіх павіннасьцей перад беларускім народам. Гэта дае права верыць, што с паміж працаўнікоў Кружка выйдуць карысные працаўнікі на славу і радасць беларускаму народу.

*Якім Съвятагор.*

## Літэратарам с кальцом у носе. *)

Нехта ягомасць Коронкевіч у № 3029 „Віл. Вѣстн.“ перэдруковывае кавалкі маей стацьці «Сплачывайця доуг» і робіць такі вывад: «беларускі рух—гэта рух не напeрад а назад». Разумеецца ягомасць Коронкевіч мае поўную рацію, каліу яго там перад, дзе у іншых добрых людзей зазвычай бывае зад і ў гэтым німа ніякаго цуду. Але гэтае маленькае атступленьне ад звычайных правоў натуры не дае ешчэ права ягомасьцю Коронкевічу верыць у тое што ён ёсць акурат нормальны людзкі тып. Ужо адно тое нечэга варта, што ён прызнае сябе за беларуса, але лічыць сваей павіннасьцю ваяваць за ўсім беларускім і забіваць усякіе праявы жыцьця у беларусоў, як у народзе

Вядомаго сорту людзей ва ўсе часы і ва ўсіх народоў, злучае адна характэрная рыса: яны не знаюць большай сьвятыні над тое карытца с катораго кормяцца. Гэткіе людзі калі пачувалі пры сабе сілу (самі яны ніколі ня могуць быць сілай), камянавалі пракокоў, труцілі Сократа, распіналі Хрыста, палілі філософоў і рэформатароў, закувалі у дыбы і гнаілі у ланцугах іначэй, як яны, думаючых і верys. чых; запрагалі у ярмо „іначэй ураджэных“. І ўсё гэта робяць са страшэннай заўзятасьцю, з бязмернай пэўнасьцю, што апрача іхняй бедненькай і брудненькай праўдачкі, німа іншых праўд на сьвеці. Адным словам людзі гэтаго палёту, састаўлялі і састаўляюць, так зва-

*) Надрукаваушы стацьцю Юрья Верашчакі «Сплачывайця доуг», Рэдакція дае мейсцо і гэтым яго думкам, лігучы, што аутор мае право даць атказ на стацьцю п. Коронкевіча.

## РОДНЫЕ КАРЭНІ.

(Апаведаньне).

1.

... А ешчэ трэба паведаміць цябе, даражэнькі сынок наш,—чытаў, лежучы на цьвёрдай канапе пасля абеда, бацькаўскую пісульку студэнт-мэдык Архіп Лінкевіч, — што у новай нашай хаці мы жыць дужа баімся...

Архіп пацягнуў раз другі папіроску, абтрос попел на бляху, буркнуў пад нос: «Што за дзіва? і зацікаўлены пачаў разбіраць далей закаручкі запэцканаго чарнілам пісьма:

... Здаецца ніразу не было таго у нашым сяле, што дзеецца цяпер у гэтай хаці...

— Ну й пісаку-ж знайшоў бацька сабе,— у голас загаварыў Архіп, ніяк ня могучы разабраць слова ў цісульцы.

Ен ізноў зацягнуўся, вылаяў у думцы пісаку, што ня гледзючы на добры селянскі пачастунак і пяць капеек, так дрэнна пішэць пісьмы, саўсім не чытэльна, і задумаўся аб далёкім родным сяле, аб мілых старэнькіх сялібах і садку, што сам з бацькам садзіў колькі гадоў назад.

„Як многа слаўнаго ў нашых вёсках сёлах, а тымчасам як яны нерухома-мёртвы у жыцьці. Час ідзець,—ў гарэ, ў воздусі лётаюць аэропланы, дырыжаблі; пад вадой жывуць людзі, як на зямлі; перэгаварываюцца на тысячы вёрстоў; даходзяць да таго, што думаюць замаражываць чэлавека па колькі трэба часу і ўзноў ажыўляць яго; усё ідзець шпарка ўперад, толькі нашу вёску, як абросшый мохам камень каля шляху, з месца не скранеш... Сумна, сумна.

— У двадцатым вяку баяцца жыць у новай хаці. А чаго?—ну, пэўне, чэрці не даюць“—так думаў—сумаваў студэнт.

... Мы ўжо й папа прывазілі і свяцілі яе, але нехта засеў у ёй і не дае начаваць... прачытаў ён і аж зазлуваў:

— Выдумаюць сабе усякіх дурацкіх зданьнёў ды й, бытцым дзеці, забаўляюцца. Як бы рабіць німа чаго; э-эх!

... У прошлы чэцьвер пайшоў батрак начаваць у ёй, бо там халадней, а у старой хаці аб цяперешнюю летнюю пару дужа душна ды й мухі спакою не даюць. А лавак у ёй мы ешчэ не паставілі, дык ён і лёг на грубцы, бо мы цяпер яе ня топім, і спаць там хараша...

Студэнту было троху сьмешна.

... Якое ўжо, не пры нас будзь казана, ліха здалося яму там, — пісалося далей у пісьме,— ці ён, можэ, з—вечара з дзеўкамі перэжартаваў, ці часам да Міхаля у каршму збегаў, хто яго там ведае, а толькі не паспелі мы заснуць у старой хаці, як раптам заляскаталі нашы вокны так, што мы аж адразу папрашнуліся і надта папужаліся. Матка й кажэ да мяне: „Нупрэй, Нупрэй, ці ня біць нас хто, лезе, што гэта робіцца?“ А я—шусь! да вакна, гляджу, — ажно гэта батрак ў вадной сарочцы, без шапкі, босы, як адурэўшый, крычыць нема: „Дзядзічка, атчыняй хутчэй!“ Атчыніў я вакно, упусціў яго, а ён трасецца, зуб на зуб не трапляе... „Што такое? Што такое? запыталіся мы. — „Нехта у новай хаці с печы мяне зваліў“. — „Злодзей, можэ, ды там жэ красці німа чаго“,—сказаў я, але батрак кляўся, бажыўся, што у хату чэлавек залезць ніяк ня мог, бо ён на пач чэп залажыў у прабой, а кіёк засадзіў і слісак с клямкі выцягнуў, дык ніхто улезці ня мог, а нехта нявідзімы, слізкімі, як вужакі, халоднымі рукамі схапіў яго за ногі і махануў с печы на мост. І запраўды у батрака быў збіты бок і абдзерты аб цэглу рукі...

— Духі завяліся там ці што?—злосна смеяўся студэнт і падумаў, што батрак пабіўся с хлапцамі за дзевак і падманіў старыкоў чартаўнёй, як найлепей.

Архіп устаў с канапы і зашагаў па сьвятліцы у задумленьні. Затужыў троху. І ўспомніў старога дзеда Міхалку, на катораго усе казалі, што ён тры гады бегаў ваўкалакам. Сам Архіп некалі даваў гэтаму веру.

— Што за народ наш беларусы! у голас задаў ён сабе пытаньне і размяркаваў, што доктарам будзе служыць на Беларусі і будзе збіраць матэрьялы аб духоўным жыцьці свайго народу.

... А надоячы пашоў начаваць ўжо я і батрак, у двох. І так сама прыбеглі ноччу у старую хату, бо я працнуўся, чуць не акалеўшы, пад зэдлікам, хоць заснуў на зэдліку, а на батрака нехта узваліўся і душыў...

— Незразумела, уцяміць нельга, што за штуковіна такая,—ламаў галаву мэдык, і на глыбіне яго душы пачалі капашыцца абразы таёмнаго, страшнаго, шчыра беларускаго.

Не дарма быў Архіп—выліты яго дзед. што да сьмерці крэпка маліўся Богу і ў той жэ час лашчыў, як можна, дамавых, лясавых, вадзяных.

... Мы ужо ставілі у куце й „пратэсы“, псалтыр чыталі і псальмы пеялі,—нічога рады німа, усяліўся нехта у хаці і не дае спакою. Ці не параіш ты чаго, а то хоць хату, разрый...

Архіп загадэўся йшчэ больш. Дачытаў пісьмо, гдзе пісалося ўжо, што кароўкі, дзякаваць Богу,

ную, таўпу. У змаганьні у вайне таўпа чваніцца і фанабэрыцца пакуль вораг уцекае, але як вораг адварачываецца таўпа гатова заўсёды кінуцца з аружжэм на сваіх і, палавіўшы, выдаць у рукі ворагу меней гібкіх сумленьнем і у карку сваіх сабратоў.

Выбачайце, чытачу, за маленькае адступленьне ад асновы гэтай стацьці. Але мнэ здавалося, што гожэ будзе прыпомніць нам, што такое таўпа, бо мы лішне прывыклі лічыцца з ей, а гэта вялікая па моему абмылка.

Варочаючыся ж стацьці ягомасьця Коронкевіча, у каторай ён кажэ, што ён беларус, але таго гатунку, каторые «вераць» што беларуская мова, гэта толькі гутарка расейскай. А затым даводзіць ён, с прычыны верша М. Богдановіча «Купідон», што беларускім дзецям не вядомы шакалад, і што ім патрэбна больш скарынка чорнаго хлеба. Відаць мяркуе пры гэтым ягомасць К., што у волю хлеба і на закуску шакаладку павінны мець толькі дзеці такіх беларусоў — каторых бацькі „веруць“, што „пры сваім развіцьці беларуская мова павінна перайсці у расейскі язык.

Мае дзеці, напрыклад добра ведаюць што такое шакалад, хоць я і іначэй „веру“. І мы, беларусы «Нашай Нівы», дабіваемся таго, каб усе беларускіе дзеткі мелі у волю хлеба і мелі на закуску шакаладку, нават тады, калі іх бацькі не выпрысягаюцца публічна свайго народу і мовы.

Што-ж датычэ „простанароднасьці“ нашай мовы, то яна ня больш простанародная, як расейская і польская, калі тымі мовамі гаворыць просты народ. Есць і ня „простанародные“ мовы, як мовы літэратурные, або як лаціна і грэка, але гэта лаціна і грэка мовы *мертвые*, бо народ просты каторы гаварыў гэтымі мовамі вымер.

Каб гэты закід зрабіў нам не беларус-перакінчык, а праўдзівы вялікарус, то я б яму сказаў на гэта: Ягомасьцю! наша мова «простанародная», але не хапаная, як ваша; нам не прыходзіцца чырванець за сваю мову, так як вам, калі вы берыцё у свае рукі «Словарь 30,000 іностранныхъ словъ въ русской літературѣ».

30,000 слоў! ня лічучы тых, каторые ўзять ад нас і ад украінцоў.

Розные нашы рэнэгаты трыста гадоў зносяць вам скарбы нашай мовы, ad maiorem gloriam Moscoviae што дня ідзе „собірацельная“ работа. Па кветках беларускай мовы увіхаюцца розные «пчшолкі», каторые высмактываюць мядок нашай паэзіі і мысьлі, кормяцца чужым дабром, а пасьля... колюць вочы за нашу непрыглядную долю.

Нашы рэнэгаты забіраюцца у недры нашай паэзіі і мовы і як эўропэйцы ад чырвонаскурых індзейцоў, за тытунь, гарэлку і сыфіліс— выдрываюць нашы векавечные скарбы. За капейку радок, літэратар с кальцом у носе нясе у вашы літэратурные яткі дзедоўскі скарб, а пасьля торкае у вочы брудным пальцам: „вѣдь это - же русскій язык“ або: «toż polska mowa».

Праўдзівые вялікарусы дагэтуль не рабілі нам такіх закідоў, а дзеля таго і мы гэтые словы звертаем не да вялікарускаго народу, а толькі дзеля ведама нашым перакіньчыкам.

П. Коронкевіч пішэ, што Достоевскій быў беларус. Так. Але і многа іх каторые нясуць у россейскую культуру ўсе, за нюх табакі праменялі скарбы беларускай душы і мовы. Тые, што йдуць іхнім сьледам цяпер; нясуць туды нават такіе словы як: «гомон», «гукаць», «патыліца», «скрыня», «рудая гліна», «брыль», „с того самого часу“ (Гл. Літэратурное прылаж. да „Нивы“ 1912 г. № 3 „Рамзай“), і многа іншых ешчэ, каторые чырвареюць у Расейскай літэратуры, ведама, як чужынцы у чужой хаці.

А сколькі-ж расейскіе і польскіе газэты што выходзяць на Беларусі бяруць „лексічнаго матерьялу“, каб пасьля торкаць на настцъ пальцамі.

Пішэ ешчэ п. Коронкевіч, што бытым мы хочэм прыдаць выгляд нярускасьці сваей мове. Напрасна! Па моему русскае ня толькі адно маскоўскае. Я напрыклад чытаў у Любавскаго (Очеркъ Исторіи Литовско-Русскаго Государства, Москва 1910), што пень русі гэта і ёсць ня што іншае, як наша Белая Русь і Украйна. А у Костомарова чытаў (Историческ. монограф. и изслѣдованія Т. І), што імя „Русь“ „Московское государство, какъ будто экспропріровало отъ исконной Русі“. Ведаю і ўсе мы беларусы ведаем, што ў той час, калі цяперэшняя Расея была «Московіей», мы пісалі і называлі сябе рускім народам. (гл. Статут Літоўскій, Біблію Скорыны і інш). і цяпер называем сябе Бела—*русамі* і ніколі і нідзе гэтаго імені не выпіраліся і ня будзем выпірацца.

*Юры Верэшчака.*

## Схамяніцеся!

Калі прыгледзіцца да жыцьця нашай вёскі і вясковых абычаёў, якіе за апошніе гады вельмі пашырыліся у нас, то на душы дужа, і дужа сумна робіцца. Ні так даўно, гадоў 15—20 таму, наша вёска была папраўдзі „ціхая, спакойная і добрых абычаёў“, чаго аб цяперэшняй вёсцы нельга сказаць. Цяпер па нашых вёсках адно і чуваць, што разбоі, ашуканствы, шэльмоўствы і лаянка, лаянка... Зрабіла ўсё гэта гарадзкая, фабрычная эдукація нашай маладзежы, каторая выежджае у гарады на заработкі. Зрабіла гэта ешчэ і салдатчына, пасьля каторай у нашы вёскі прыносіць маладзеж „навінкі“ ат каторых, такі напраўду пачынаюць гніць людзі душой і целам.

Вялікіе гарады маюць многа добраго, маюць культуру і навуку, але цёмные пустые галовы, шукаюць пустога і цёмнаго, што і знаходзяць па гарадзкіх корчмах, па публічных дамах і інш. Ныраюць, пабыўшы у горадзе па вушы у гарадзкім балоці, у гарадзкім брудзе і гэты бруд прыносяць у вёскі. Каб нашы «эдукаваные» па гарадзкому «панічы» прынасілі толькі расейскую песьню і расейскую мову, то гэта ешчэ нічога, з гэтым ешчэ можна было-б мірыцца. Праўдзівай культуры расейскай яны не прыносяць, а прыносяць гразь расейскай культуры—брыдкіе лаякі і брыдкіе абычаі, каторых ня толькі усякая культура, але усякі чысты сколькі небудзь чэлавек, староніцца і бароніцца.

Упадак маральнасьці і культуры па нашых вёсках ідзе шпаркім крокам, ідзе наперад дзякуючы таму, што народ наш адрэзан ад людзей сьвятлейшых, дзякуючы таму, што колькі соцен гадоў розные нянькі убівалі нашаму народу у галаву, што ён горшы за ўсіх—пакуль не атабралі у яго веры у сваю людзкую годнасць і пашаны да свайго роднаго. Цяпер растуць пасевы гэтаго „харошаго“ севу, ужо некатогым сяўцом прыходзіцца пажынаць іх і пробаваць смак: горкі ён. Але хто-ж сеяў? Хто сеіць?

Нашаго селяніна рвуць на права і на лева; адны кажуць, што ён павінен прыняць мову і абычай расейскіе, другіе—польскіе. Адны і другіе ганбяць перад ім яго роднае, вырываюць старую, прадвечную культуру дзядоў і прадзедоў і даюць ў замен гразь сваіх культур па гарадзкіх шынках.

І гледзючы на ўсё гэта мімаволі яўляецца пытаньне: ці мы калі адродзімся? Ці мы калі атрахнём с сябе гніль, якая зачынае на нас нарастаць са страшэннай быстратой, ці мо суджэна нам згніць і прапасьці? Ці знайдзецца у нас людзей такіх, каторые-б пасьвяціліся высокай апостальскай працы адраджэньня уміраючай бацькоўшчыны? Араджэньня яе моральнаго і національнаго, а перш за ўсе моральнаго.

*Задзісенкавіч.*

## Аб усім па троху.

### Змаганьне работнікоу з буянствам (хуліганствам).

Разрастаючаеся апошнімі часамі у Пецярбурзе буянство прымусіло работнікоў узяцца за гэту справу і прыдумаць способы змаганьня з ім. На адбыўшыхся з гэтай прычыны сабраньнях выясьнілося, што блізка што у кожнай фабрыцы ёсць яўные буяны, ці як расейцы называюць-хуліганы, каторые крыўдзяць кабет, бьюць сваіх сяброў работнікоў, калі тые не даюць ім на пахмельле, непрыстойна лаюцца і інш. На сабраньнях работнікі пастанавілі згаварыцца с прафэсіональнымі і культурна-прасьветнымі арганізаціямі і разам з імі вырабіць план, як змагацца з буянствам. Пакуль што пастанавілі выганяць буяноў с фабрык, калі іншые, лягчэйшые способы не памогуць.

### Сельска-гаспадарскіе хаурусы у Віленшчыне.

У віленшчыне ёсць цяпер 35 сельска-гаспадарскіх кружкоў, з гэтаго чысла у гэтым гаду заложэных 8. Справе разьвіцьця сельска-гаспадарскіх кружкоў у Віленшчыне дужа перэшкаджае тое, што селяне з недаверьем адносяцца, да чужой національна інтэлігенціі, каторая, звертаючыся да селян ужывае іншай, малазразумелай мовы. Самі-ж селяне лішне бедны і цёмны на тое, каб свае справы браць у свае рукі.

### Разрост газэт у Расеі.

Ад 1905 году пачалі страшэнна множыцца у Расеі газэты. 50 гадоў таму назад у Расеі выходзіло усяго толькі 14 штодзенных газэт, перад абвешчэньнем маніфэсту было 110 штодзенных газэт, а цяпер штодзенных расейскіх газэт выходзіць 411.

---

пагулялі, малака даюць даволі, жэрабёнка прадалі Зэліку, падсвінак здох, яблак урадзіло дужа-дужа многа. А потым ішоў цэлы ліст паклонаў „ат белаго ліца да сырой зямлі“.

Студэнт памаўчаў троху і шчэкаўзнуў пальцамі і тут жэ падскочыў ад раптоўнай думкі— паехаць самому дамоў на гэту чартаўшчыну.

— Яблак, гуркоў, суніц, чарніц, малін, грыбоў цяпер там... На сенакосі с касою гуляну, як у старыну калісь, з дзеўчаткамі знаёмства старыннае ўспомню, — пацешаўся студэнт, — а старыкі будуць рады-рады.

Думкі-хмары яго разляцеліся.

— К чорту ўрокі, перэдам вучэнікоў таварышам, хопіць грошы, а то ешчэ зараблю у зімку, як-небудзь узнясу за праваўчэньня, а цяпер жэ у нашай вёсцы—сяле закутным—рай!

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

На другі дзень Архіп ужо тросся на чыгунцы.

---

### 2.

— Ну й коні ж тваe! С крупадзёркі на скуру прадалі ці што? — запытаўся Архіп у балагольшчыка дзівуючыся, што едуць яны—ціщэй некуды.

— А як зэ... Быц вы тое ведалі, пане Лінкевіч, ведама сто ш крупаджоркі...

— Ну, ну паганяй, ато мы й к раньню не давалачомся.

— Гэ, гэ, гэ! Нэ-э, пасьлі, мае лярвацкі, зацмокаў жыд, спёбаючы пугаю па зямлі. — Даеджым, пане, даеджым.

Коні лавілі пугу хвастом, дрыгалі нагамі і гультайліва трасьлі па калюгах балагольскую будку.

Лес кончыўся. Выехалі на поле. Дарога пайшла раўнёй. Архіп залюбаваўся хараством летнаго вечэра. Сэрцэ ласуна да красы забілося дужэй у маладых грудзёх яго. Наўкруг было так ціхамірна і так панябеснаму святочна і прыгожа. Цямнела. На захадзі гарэла зара.

— Джу-нгу-у...—паляцеў жук.

— Мэ, э, э... замаркатаў у гарэ каля балота дзікі баран (чэпік); сеў нейдзе на купіні.

Абапал дарогі было жыта у капох і на карэню, што не пасьпелі ешчэ зжаць. С аржанішча нёсся прыемны, мілы, лёгкі, мяккі жытны пах. З логу ціхі, цёплы ветрых тхнуў сенам. На небі паказалася зорачка, другая, трэцяя...

— Го-го-го,—каціліся далёка па лесі.

— Тпроля, тпроля, тпроля, — клікаў нехта жэрабёнка.

Чутна у перадзі па дарозі: „Скры—гы скрыгы,—вязуць нешта, ці снапы, ці сена, а можэ й хворасць.—„Нэ, нэ“,—бадрыць коні паваждай, а яны цяжка йдуць па пылу, толька: „Шлёп-шлёп, шлёп-шлёп“,—чуваць здалёку. Чарнеюцца вазы далёка, бліжэй, во адразу вынырнулі:

— Добры вечэр! Ці далёка тут да Белі?

— А вярстоў пяць набярэцца.

— З гакам,—дадае з за возу другі голас.

— Нэ э э! — паехалі далей, і ўзноў: „Скрыгы-ы“...

На дарозі гоман. Ідуць с поля людзі, за гэткі дзянёк пазамарыліся, напрацаваліся.

С-пад лесу нясецца-коціцца песня — жнеі йдуць ат Хаіма с падзёншчыны. І праца не бярэ маладых, красных на здароўе, круглалікіх дзевак... о! песня, яны паюць:

— Загарэлася вячэрная зара:

А з другога боку ідуць са свайго поля жнеі, там пяюць:

— А-у ку-у-узнічцы, а-у ку-у-узнічцы...

Маладые, зычные галасы смакуюць сьпеў, і ён рвецца са здаровай душы у дужым, ня хворым целі:

... Куюць-куюць маладые кавалі.

Водгалас доўга ляціць па лесі. Эх! і пагода-ж, пагода будзе назаўтра. І далей песня:

А скуй, каваль,
А скуй, каваль,
А скуй, каваль,
Нашай Дуні андарак.
А скуй, каваль,
Нашай Дуні андарак.

І жнеі, і песня, і гоман. Праезджаюць ціхую вёску; агнёў німа, сабака нейдзе гаўўкнуў і змоўк, у пунях, хлявох жвуць каровы, а гаспадыні старые, што заранеі с поля прыйшлі, там з даёнкамі: цур цур, цур-цур...

Праехалі мосцік, ярыня пайшла, а на полі цямней ды цямней. Усё неба зорамі гарыць, дзіўнае, пекнае, цудоўнае хараство разліто ў ём.

— Драў, драў, драў,—скваярэцца драч, і ён сціх. Ціха-ціха...

Не, во чуваць збоку ешчэ — павялі начлежнікі коні ў лес пасьвіць. Смяюцца, рагочуць, жартуюць. Нейкі скалазуб сумысля вугнава зацягнуў прыпеўкі:

Не хадзі ты па балоту,
Не мачы ты ног, ног...
Не любіся з багатаю,—
Не паможыць Бог, Бог...

— Ай-я я-я, я-я-я,—якочыць прыстаўляецца каторы-то хлапчук.

Багатая—гарбатая,
А к таму-ж і пышна.
А бедная дык чэсная,
Як у садзі вішня.

— Трым-трым, трым-трым,—у тахт басуюць другіе хлопцы, вясёлые, радые.

Усё ў полі супакоілося. А ні гука. Архіп

гэтак сама не дуракі, ведаем, як абхадіцца, як сеяць. Пра сяўбу лепшым зярнем не раз мы чулі, вось і сёлетняй зімой аграном казаў і малюнкі паказываў, ды мы свой розум маем“.

Калі я папытаў, ці выходзяць у іх на хутары і як яны самі на гэта глядзяць, яны, як бы свайму ворагу, пачалі крычаць: „На хутары? Не, мы не баімся, мы ня обшчынскіе, мы на купленай зямлі сядзім; нас ніхто не прымусіць ісці на хутары“.—„Каго ж гэта прымушаюць? На гэта трэба свая згода, свая просьба а выхадзе».—«Ведаем мы просьбу: пасадзяць у халадоўню, і ўсе“. —„Гдзе-ж так было?“—„У абшчынскіх, старшыня так рабіў. Але нас ён не кране“. Калі я стаў атказываць, што тут багата выдумкі, што рабіўшы так, старшыня мог сам пасядзець у цёмнай, яны, не згаждаючыся са мной, дзіка вадзілі вачамі у маю старану.

Нічога мне не аставалася рабіць, як пажалець іх, такіх цёмных і упартых.

*Саука Каваль.*

## С чарнігаушчыны.

Паўночная палавіна чарнігоўскай губэрні, паветы: городненскі, мглінскі, ноўгарад-северскі, новазыбкаўскі, старадубскі і суражскі, належаць да Беларусі. Цікава тут толькі тая асобнасць, што чарнігоўскіе беларусы, хоць і гавораць мовай чысьцюсенькай беларускай, называюць сябе, і другіе іх называюць, літвінамі. Адзін нават этнограф запісываючы песьні беларусоў чарнігоўскай губэрні назваў іх песьнямі «Беларусоў-Літвіноў».

Жывуць чарнігаўскіе беларусы дужа бедна, бо сядзяць на землях неураджайных, але лясістых. Лясы даюць чарнігоўцам не малы заработак з грыбоў і ягад. Па дастаўцы грыбоў, чарнігоўская губэрня займае першае мейсца у Расеі. Гады таму два адзін чарнігоўскі земец з атчотаў жал.-дорожных станцій вылічыў, што с чарнігоўскай губэрні у той год вывезена было блізка на 200 тысяч рублёў сушэных грыбоў і ягад. Фабрык у граніцах губэрні мала, а дзеля гэтаго вольные рабочые рукі атходзяць на чужыну шукаючы заработкоў. Мужчыны найболей ідуць на Украйну на работу у цукраварнях і на работу у капальнях дзе с пад зямлі дабываюць камянны вугаль. Работа гэта цяжкая і канчаецца зазвычай утратай здароўя: сухотамі, недакроўем, або калецтвам. Ня лепей дзееца і с тымі селянамі, каторые выежджаюць у гарады і фабрыкі з іх немала хто прыносіць, як безплатны прыдатак гарадзкой культуры, паганые розные хваробы, пьянства і буянства. Апрача выхаду у гарады на поўдзень Расеі, чарнігоўскіе беларусы у апошніе гады пачалі выежджаць і у Амэрыку. Выежджаюць у Амэрыку найболей сільные, здаровые і энэргічные людзі, гадоў ад 25 да 30 жыцьця. Добрая палавіна на амэрыканскім берэзі марнуецца, ад хвароб і голаду, але бываюць і такіе, каторые прывозяць с сабой амэрыканскіх грошы і абгаспадарываюцца пасьля у сваей старонцы. Апрача мужчын выходзяць, што лета с чарнігоўшчыны на поўдзень Расеі цэлымі грамадамі дзеўчаты і кабеты, працуюць яны там на тутунёвых плантаціях ў дужа цяжкіх і дрэнных варунках.

Гэтак жывуць браты нашы беларусы у чарнігоўшчыне. Беларускае адраджэньне, як вясенная ластавачка, даляцело і сюды. За апошніе два гады у Чарнігаве было выдана колькі беларускіх кніжэк, а паэма „Тарас на Парнасе“ выйшла нават двумя выданьнямі. Поле для нацыональнай беларускай працы у чарнігоўшчыне шырокае, толькі, пакуль што, мала сяўцоў.

*Чарнігавец.*

## З усіх старон.

### Сьвідзецельствы аб благонадзёжнасьці.

Міністэрства ўнутрэных спраў выясьніло, што пасьведчэньня аб благонадзежнасьці і посьведчэньня аб непадсудзімасьці павінны выдаваць такіе урады:

Пасьведчэньня аб тым, што чэлавэк ня быў ні пад судом, ні пад следзтвам, у справах палітычных, павінна выдаваць канцэлярыя губэрнатара і начальніка гораду.

Пасьведчэня-ж аб тым, што чэлавек не судзіўся ані атбываў кару за ашуканства і інш, павінна выдаваць паліція.

### Помач тонучым.

Міністэрства судоў апрацавало праект закону, каб караць тых людзей, каторые бачуць, як людзі топяцца, а не ратуюць іх·

### Сем смертных прыгавароу.

Маскоўскі ваенны суд засудзіў на сьмерць семо чэлавек, каторые у Маскве у Бутырскай турме зрабілі бунт і хацелі уцячы, прычым забілі вартаўнікоў.

### Нелегальная друкарня.

Нідаўна у Пецярбурзе паліція выкрыла друкарню расейскай соціал-дэмократычнай партіі. Уночы, а 3-гадзіне увойшла паліція у кватэру Рядчікова, на полюстраўскім завулку, і знайшла разные друкарскіе прыборы. Рядчікова і студэнта Беляева арыштавалі і пад сільным канвоем адправілі у ахрану. У звязку з гэтай друкарняй, на вялікай і малой охці зроблена было многа обыскоў.

### Новая кітайская сцена.

„Русск. Молва“ пішэ, што апошнімі часамі паўстаў праект, каб усю заходную граніцу Расеі, ад Балтыцкаго да Чорнаго мора адгарадзіць драцяной сеткай. Мае гэта быць зроблена с тым, каб лягчэй было лавіць кантрабандістоў. Загародка тая обойдзецца каля 20 мільёноў рублёў.

### Цікавяцца украінцамі

Міністэрства ўнутрэнных спраў, звярнулося да кіеўскаго губэрнатара каб той сабраў падробные вядомосці аб чысьле украінскіх бібліотэк і таварыствоу, у каторых говораць па украінску, а такжэ сколькі ёсць членоў у гэтых таварыствах. Украінцы не спадзяюцца, каб гэта цікавасць ім на здароўе пайшла.

### „Мужыцкая прауда“.

У першых чыслах гэтаго месяца у горадзе Раненбурзі (Разанск. губ.), вышла часопісь „Мужыцкая правда“ Гэтае названьне газэты дужа неспадобалася начальству і разанскі губэрнатар выдаў цыркуляр, каторым забараніў выпісываць гэту газэту валасным праўленьням Гэта-ж ўсёж-такі лепей чым «Н. Н.» каторая забаронена цыркулярамі не адным валасным праўленьням.

### Забастоука.

У Баку забастоўка на карасінавых промыслах с кожным днём разрастаецца.

Работнікі кажуць, што карасіна дужа подаражэла, а ім плацяць так сама як і плацілі тады, калі плацілі за пуд карасіны ўсяго толькі 14 капеек.

## Мітава.

*(Ад уласнаго карэспандэнта).*

З Лепэльскаго павету Бабыніцкай, Варанецкай Кубліцкай і Судзілаўскай валасцей увесь крапчэйшый працоўный люд на ўсё лета пераезджае да Мітавы на заработкі тутака працуе на цегляных заводах, а у восень едзе да дому з грашыма, прывозюць гэты працаўнікі ад 25 да 200 рублёў, гэта дужа карысна для нашай старонкі, але беда што разам з грашыма гэтые працаўнікі на возюць дамоў вядамай цяпер хваробы над хваробамі— пьянства. Нашы беларусы у Лепэльскім павеці (ні знаю як па другіх бо у другіх ня быў) цьверазей за расейцаў але тут каля Мітавы па цэгляных заводах бадай палавіна ёсць маскалёў, дык яны мала ня ўсе заработкі аддаюць на гарэлку, а ад іх і нашы беларусы вучацца піць, рабіць бойкі ды граць у карты на грошы; як гэты нашы працаўнікі прыдуць да дому на бацькаўшчыну дык і тутака яны маючы патроху грошы, пачынаюць піць ды граць у карты, лаяцца «па руску» вядомым расейскім словам што ажно брыдка слухаць, але дома часамі хто з бацькоў у каго яны ёсць, ці там радня ня пусцюць калі дужа ўжо разьюшыліся, а тутака дык ім ніякай перашкоды німа. што здумаў тое і рабі. Тутака я жыву паміж гэтых працаўнікоў з самай вясны і добра нагледзіўся на гэту справу. Што самі нашы працаўнікі беларусы набіраюцца ад маскалёў такой хваробы дужа нудна становіцца сэрцу, але ешчэ нудней, як падумаш, што сюды з бацькамі, братамі і раднёй пріезджае многа малых хлопцоў гадоў ад 13 і гэтые разам з вялікімі пьюць гарэлку і вучуцца да ўсяго благога, у рэшці гэта благое глыбока пушчае карэньня ў нашых беларусоў і вырываць гэтае благое з іх бадай будзе нияк, алі можэ ускорасці сьвет навукі адчыніць вочы гэтым сляпцам бо яны, як я прымеціў і ні знаюць, што робюць ня добра.

*Пятрок Саучонак.*

Рэдактар-Выдавец
А. Уласоу.

**За 4000 р.**

хачу прадаць 35 дзесяцін добрай **зямлі** каля возера **з будынкамі** і трохі **лесу**—асабняк
У Троцкім павеці, Сумілішскай вол., хутар Варкутаны.
Згаварыцца можна: Вільня, Лукішкі, Магометанская вул. № 8, *Халецкі.*

**ДВОХМЕСЯЧНЫЕ КУРСЫ**

**па садаводзтву і пчэлаводству для усіх.**

Пры віленскай школе садоводзтва устроены будуць ад 1 да 15 жніўня тэорытычна - практычнае курсы і ад 1 лістапада да 15 сьнежня, вечэрамі у цэнтры гораду тэорытычные курсы.

Плата 20 рублёў. Хто здасць экзамен атрымае атэстат.

Падробна даведацца можна у канторы І. Павловіча, Ботанічная № 1, ад 7—8 гадзіны вечэрам.

8-ы год выданьня. **Прыймаецца падпіска** 8-ы год выданьня.

**на першую беларускую газэту**

**„НАША НІВА“**

У 1913 гаду „НАША НІВА“ пойдзе па тэй дарозе, па якой ішла сем гадоў, і будзе далей жывым люстрам жаданьнёў і патрэб беларускаго народу.

„НАША НІВА“ будзе працаваць над адраджэньнем нацыональным, грамадзянскім і людзкім беларусоў, шануючы правы другіх націй нашаго краю і цьвёрда паказываючы граніцы, перэхадзіць каторые непавінна ні адна нація, каб не было шкоды іншым.

Гадавымъ падпісчыкам і поугадавым высылаецца дар ма „**Беларускі календар**“ на 1913 г.

**Падпіска на 1 год—2 руб. 50 кап., на 6 мес.—1 руб. 25 к., на 3 мес.—65 кап.**

**Не купляйце штучны навоз (парашок, попел) абы дзе па крамах,**

**а купляйце там, дзе прадаюць найтаней добры тавар,**

**У СКЛАДЗІ ВІЛЕНСКАГО ТАВАРЫСТВА**

**СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ**

*Вільня, Завальная вуліца № 9.*

**Там жэ можна купляць усякую гаспадарскую прыладу.**

Усім, хто захочэ, высылаецца цэннік.

**Выпісывайце хаурусна цэлымі вагонамі тады абыдзецца вельмі танна.**

**„БУЛЬБАКОП“ СУДАКОВА**

**Цэна 35 руб.**

Калі прылада неспадабаецца дык прыймаецца назад і грошы зварачываюцца.

**Заказываць да 10 ліпня.**

*Адрэсъ: Змієвка, Орловской губ. И. А. Судакову.*

Друкарня „Артель Печатнаго Дѣла“ Віленская, 25, тэлеф. 199.